# ТЫПАЛАГІЧНА-СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТЭМПАРАЛЬНЫХ СІНТАКСЕМ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***Г. Ч. Рыжковіч***

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Э. Ажэшка, 22, 230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь,*
*annamichalouskaya@mail.ru*

Задача выдзялення і класіфікацыі элементарных сінтаксічных адзінак, якія служаць асновай для ўтварэння адзінак больш складаных узроўняў, з'яўляецца актуальнай для сучаснага мовазнаўства. Такімі адзінкамі з'уляюцца сінтаксемы. Разам з флексіяй і лексічным значэннем назоўніка характар сінтаксемы і яе фарміраванне на сінтаксічным узроўні забяспечвае прыназоўнік, якія выконвае сінтаксемаўтваральную функцыю. У артыкуле разглядаюцца тэмпаральныя сінтаксемы і прыназоўнікавыя адзінкі, якія выконваюць ролю фарманта тэмпаральных сінтаксем.

***Ключавыя словы***: сінтаксема; тэмпаральная сінтаксема; фармант сінтаксемы; лексічны кампанент сінтаксемы; прыназоўнікавая адзінка.

Паняцце сінтаксемы ўвёў у лінгвістычны абарот А.М. Мухін у 60-я гг. XX стагоддзя [5]. Згодна з канцэпцыяй лінгвіста, сінтаксема ўяўляе сабой адзінства формы (сінтаксічнай) і зместу, г. зн. яна аб'ядноўвае сінтаксічныя элементы ў якасці яе варыянтаў, якія выконваюць сэнсаадрознівальную функцыю ў мове і характарызуюцца пэўнымі дыстрыбутыўнымі (сінтаксічнымі) прыкметамі [5, с. 55–56]. Г. А. Золатава разглядала сінтаксему як «мінімальную, далей непадзельную семантыка-сінтаксічную адзінку мовы, што выступае адначасова як носьбіт элементарнага сэнсу і як канструктыўны кампанент больш складаных сінтаксічных канструкцый і характарызуецца, такім чынам, пэўным наборам сінтаксічных функцый» [2, с. 4]. Адметнымі прыкметамі сінтаксемы служаць, адпаведна меркаванню даследчыцы, 1) катэгарыяльна-семантычнае значэнне слова, ад якога яна ўтворана, 2) адпаведная марфалагічная форма і 3) здольнасць сінтаксічна рэалізавацца ў пэўных пазіцыях. Такім чынам, сінтаксема характарызуецца трыма асноўнымі прыкметамі: формай, значэннем і функцыяй [2, с. 9].

Як адзначае М. І. Канюшкевіч, структурна сінтаксема падзяляецца на фармант і лексічны кампанент. Сродкам выражэння фарманта сінтаксемы служаць прыназоўнік у спалучэнні з флексіяй (***з** лес**у***), толькі прыназоўнік (***на** потым*) або толькі флексія (*сястр**ой***). Прыназоўнік, выконваючы ролю фарманта сінтаксемы, выступае таксама маркёрам яе сінтаксічнай пазіцыі. Такім чынам, прыназоўнік не толькі фарміруе сінтаксему, але і забяспечвае яе значэнне [4, с. 5].

Тэмпаральныя прыназоўнікавыя адзінкі ў беларускай мове фарміруюць чатыры тыпы сінтаксем: тэмпаратыўныя, тэрмінатыўныя, дыменсіўныя і

дыстрыбутыўныя. У Рэестры М. І. Канюшкевіч [3] і Беларускім нацыянальным корпусе [1] намі было выяўлена 1527 прыназоўнікавых адзінак з тэмпаральнай семантыкай. Колькасную суаднесенасць тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак па тыпах фарміруемых імі сінтаксем прадставім у выглядзе табліцы [Табліца 1].

*Табліца 1*

| Тып сінтаксемы | Колькасць тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак |
|---|---|
| тэмпаратывы | 649 |
| тэрмінатывы | 474 |
| дыменсівы | 356 |
| дыстрыбутывы | 7 |
| Усяго: | 1527 |

Тэмпаратыўнае значэнне з’яўляецца самым распаўсюджаным. Тэмпаратыўныя сінтаксемы абазначаюць “час, у які працякае дзеянне” [1].

Прыназоўнікавыя адзінкі могуць фарміраваць уласна тэмпаральныя сінтаксемы. Напрыклад, *а* чым / якой гадзіне: ***а** дванаццатай гадзіне*, ***роўна а** палове першай*, ***а** вясне*; *аб* чым / якой гадзіне / калі: ***аб** адзінаццатай гадзіне*; *аб пары* чаго / калі: ***аб пары** ўтварэння*; *акурат пад* што / які час: ***акурат пад** Новы год*; *акурат перад* чым: ***акурат перад** святам*; *апоўдні* чаго: ***апоўдні** гарачага дня*; *а палове на* што / які час: ***а палове на** дзясятую*; *апасля* каго / чаго: ***апасля** першай паловы сустрэчы*, ***апасля** Дэкарта*; *беспасярэдне перад* чым: ***беспасярэдне перад** нашым нараджэннем*; *ва врэмя* чаго: ***ва врэмя** вайны*; *ва ўгодкі* каго / чаго: ***ва ўгодкі** паражэння* і інш.

Таксама сярод тэмпаратыўных сінтаксем намі выдзелены:

1) дакладны тэмпаратыў (***роўна ў** 2.30*, ***роўна а** трынаццатай*, ***якраз у** поўнач*);

2) храналагічны тэмаратыў (***канца** XX стагоддзя*, ***на канец** года*, ***у канцы** 1905 года*, ***у сярэдзіне** I тысячагоддзя*);

3) таксісны тэмпаратыў (***на** паляванні*, ***на год** абароны дысертацыі*, ***на момант** выхаду*, ***на час** адпачынку*, ***пры правядзенні** фінальнага паядынку*, ***пры паяўленні** бугалтара*);

4) суб’ектны тэмпаратыў (***за цараванне** Кацярыны*, ***пры** Касцюшцы*, ***за панаваннем** Аляксандра II*);

5) прыблізны тэмпаратыў (***амаль у канцы** стагоддзя*, ***дзесьці пры канцы** верасня*, ***дзесьці перад** святам*, ***крыху бліжэй да** Каляд*, ***дзесьці перад** Новым годам*, ***незадоўга да** сваёй смерці*);

6) тэмпаратыў непасрэднага следавання (***адразу за** стрэлам*, ***адразу апасля** конкурсу*, ***адразу па** вайне*, ***адразу па выхадзе** зборніка*, ***пасля** размовы*, ***услед за** сімптомамі*);

7) тэмпаратыў папярэдняга дзеяння (***перад** вяселлем*, ***перад заходам** сонца*, ***перад канцом** свету*, ***перад пачаткам** работы*);

8) тэмпаратыў – кропка адліку (***ад часаў*** *Тадэвуша Касцюшкі*, ***з першых дзён*** *жыцця*, ***з пачаткам*** *вайны*);

9) тэмпаратыў-экзісцыентыў (***з пераходам да*** *абраду*, ***з пераходам на*** *новы прынцып*, ***з узнікненнем*** *ВКЛ*, ***з утварэннем*** *новага пісьменніцкага саюза*);

10) тэмпаратыў даты (*загад* ***ад*** *1 ліпеня 2006 года*, ***за*** *2000 год*, *вынікі* ***на*** *першае верасня*);

11) тэмпаратыў адначасовасці (***адначасова з*** *навучаннем*, ***па ходу*** *работ*);

12) паступальны тэмпаратыў (***з набліжэннем*** *даты юбілею*, *з павелічэннем п*, ***з надыходам*** *XX стагоддзя*);

13) фазавы тэмпаратыў (***у стадыю*** *ўвасаблення*, ***у фазу*** *перадкапіталістычнага развіцця*, ***у эпоху*** *касмічнага турызму*, ***у этап*** *свайго развіцця*);

14) цыклічны тэмпаратыў (***у перыяды*** *менструацыі*);

15) тэмпаратыў-сітуатыў-кваліфікатыў (***у бытнасць*** *старшынёй калгаса*);

16) тэмпаратыў-карытыў (***без*** *чвэрці гадзіна*).

Тэмпаратыўныя значэнні, для выражэння якіх служаць тэмпаральныя прыназоўнікавыя адзінкі, могуць быць ускладнены прасторавымі значэннямі. Напрыклад, прыназоўнікавая адзінка *у плыні* чаго фарміруе тэмпаратыўна-каузатыўную сінтаксему: *Творы засталіся. А гучныя дэкларацыі патанулі* ***ў плыні часу*** (В. Зуёнак). Намі выяўлены таксама тэмпаратыўна-лакатыўныя сінтаксемы, якія сведчаць пра сінкрэтызм прасторава-часавых значэнняў. Ролю фармантаў тэмпаратыўна-лакатыўных сінтаксем выконваюць наступныя прыназоўнікавыя адзінкі: ***за парогам*** *века*, ***на пад'ездзе да*** *Мінску*, ***на падыходзе да*** *хаты*, ***пры выхадзе са*** *школы*, ***у знаку*** *Цяльца*.

Таксісны тэмпаратыў следавання фарміруюць прыназоўнікавыя адзінкі, у склад якіх уваходзяць першасныя прыназоўнікі *пасля, праз, па*. Лексічны кампанент такіх сінтаксем выражаны падзейнымі назоўнікамі: ***па прашэсці*** *часу*, ***пасля завяршэння*** *загрузкі*, ***пасля заканчэння*** *працы*, ***праз*** *дзесяць год* ***па заканчэнні*** *вайны*, ***праз*** *месяц* ***пасля пачатку*** *заняткаў*, ***па заканчэнні*** *вучобы*. Таксісны тэмпаратыў адначасовасці фарміруюць прыназоўнікавым адзінкі, структурным кампанентам якіх з'яўляецца першасны прыназоўнік *у*: ***у хадзе*** *сутычак*, ***у хвіліну*** *расстання*, ***у хвіліны*** *смутку*, ***у час*** *падарожжа*, ***у часу*** *голада*, ***у часе*** *касавіцы*.

**Тэрмінатыўныя** сінтаксемы абазначаюць час, тэрмін дзеяння [1], дзеянне працякае на працягу пэўнага часавага прамежку, пры гэтым заўсёды ўказваецца пачатковая і канчатковая часавыя межы працякаемага дзеяння.

Прыназоўнікавыя адзінкі дадзенай групы фарміруюць наступныя тыпы тэмпаральных сінтаксем:

1) уласна тэрмінатыўныя (***ад** раніцы, **ад** вяселля, дажыць **да** світання, працавалі **да** цямна, **да канца** 2030 года, **за гады** акупацыі, **к канцу** напісання паэмы*);

2) дакладны тэрмінатыў (***роўна да** лістапада, **дакладна да** серады, **роўна з часу** паўстання*);

3) прыблізны тэрмінатыў (***як мінімум з** кастрычніка, **недзе аж да** ранку, **прыкладна к** чэрвеню*);

4) тэрмінатыў-інтэнсіў (***аж да** часоў Гедыміна, **аж да часу** мангольскага нашэсця, **аж да** лютага 1917 года*);

5) тэрмінатыў-экзісцыентыў (***да выезду** з Нясвіжа, **да выхаду** з хаты, **да заканчэння** дзейнасці*);

6) таксісны тэрмінатыў (***не пазней чым за** 5 дзён **пасля** заканчэння імі вучобы, **не пазней чым** тры месяцы **з дня** звальнення*);

7) тэрмінатыў-кропка адліку (***ад дня** рэгістрацыі, **ад моманту** бліскавіцы, **ад пары** вяселля, **ад пачатку** ўрачыстасці, **з дня** нараджэння, **з дня** няволі*);

8) тэрмінатыў-канчатковая кропка (***да канца** месяца, **да парога** новага тысячагоддзя*);

9) пачатковая і канчатковая кропкі часавага адрэзка (***да канца** месяца **з моманту** паражэння, з тых часоў **і па** сёння, **з** XI **па канец** XVII стагоддзя*).

**Дыменсіўныя** сінтаксемы абазначаюць колькасную характарыстыку дзеяння [4]. Дыменсіўныя сінтаксемы прадстаўлены наступнымі тыпамі:

1) дыменсіў-патэнсіў (*гаварыць **аб** адну ноч, **за** адну ноч, **на** некаторы час, **на працягу** года*);

2) прыблізны дыменсіў (***больш чым на** тыдзень, **працягласцю больш чым** месяц, **працягласцю больш за** тры тыдні*).

Дыменсіўныя сінтаксемы з семантыкай прыблізнага часу могуць быць ускладнены ўказаннем на ніжнюю, верхнюю межы часавага адрэзка:

– прыблізны дыменсіў з верхняй межай часавага адрэзка (***працягласцю да** 15 сутак, дзеці **ва ўзросце да** года, **маладзей** 18 гадоў*);

– прыблізны дыменсіў з ніжняй межай часавага адрэзка (***працягласцю звыш** 45 сутак, **тэрмінам болей чым на** адзін месяц*);

– прыблізны дыменсіў з верхняй і ніжняй межамі часавага адрэзка (***ва ўзросце ад** 10 месяцаў **да** 8 гадоў, **працягласцю ад** аднаго **да** пяці гадоў, **у інтэрвале ад** некалькіх дзясятых секунды **да** некалькіх секунд*).

**Дыстрыбутыўныя** сінтаксемы абазначаюць раздзяляльны час [1]. Дадзенае значэнне выражаюць прыназоўнікі што … *ад* чаго, *ад* чаго … *да* чаго, колькі адзінак *на* колькі адзінак, бел. *па* чым. У сінтаксемах: *дзень ада дня, **ад** выпадку **да** выпадку, сем пятніц **на** тыдні, **па** святах.*

Тэмпаральныя прыназоўнікі (130 адзінак) могуць таксама фарміраваць квантытатыўныя сінтаксемы: ***болей** пяці гадоў, **болей чым** месяц, **звыш** сямі*

*стагоддзяў*, ***крыху больш за*** *тыдзень,* ***менш чым за*** *стагоддзе,* ***на*** *12 хвілін* ***пазней***, ***не больш чым на*** *тыдзень,* ***не меней*** *года.*

Квантытатыўныя сінтаксемы ў большасці выпадкаў спалучаюцца з іншымі тэмпаральнымі значэннямі. Намі выяўлены наступныя тыпы сінтаксем:

– квантытатыўна-тэмпаратыўныя: ***не больш чым праз*** *15–20 хвілін,* ***не больш як*** *месяц* ***назад,*** ***не далей як*** *два месяцы* ***таму назад***;

– квантытатыўны-тэрмінатыўныя: ***меней як на*** *год–паўтара,* ***не на больш чым*** *10 хвілін*;

– квантытатыўна-дыстрыбутыўныя: ***да*** *20–25 разоў* ***на*** *суткі,* ***не болей як*** *20 гадзін* ***у*** *тыдзень,* ***не больш як па*** *два тыдні,* ***не меней як*** *5–6 гадзін* ***на*** *дзень,* ***не часцей за*** *адзін раз* ***у*** *месяц,* ***па*** *некалькі разоў* ***на*** *дзень.*

Такім чынам, прыназоўнік выходзіць за рамкі марфалогіі, паколькі ён, выконваючы ролю фарманта сінтаксемы, уводзіць яе ў выказванне і забяспечвае яе значэнне, таму ў сучасным мовазнаўстве прыназоўнік разглядаецца як морфасінтаксічная катэгорыя. Тэмпаральныя прыназоўнікавыя адзінкі фарміруюць тэмпаратыўныя, тэрмінатыўныя, дыменсіўныя, дыстрыбутыўныя сінтаксемы, а таксама сінтаксемы з сінкрэтычнай семантыкай.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Беларускі N-корпус [Электронный ресурс]. URL: bnkorpus.info (дата обращения: 15.09.2019).

2. *Золотова Г. А.* Синтаксический словарь : репертуар элементарных единиц русского синтаксиса. М. : Наука, 1988. 386 с.

3. *Канюшкевіч М. І.* Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання : матэрыялы да слоўніка: у 3 ч.. Гродна : ГрДУ, 2008–2011. 3 ч.

4. *Конюшкевич М. И.* Синтаксемообразующая функция предлога и механизмы опредложивания знаменательной лексики // Вопросы функциональной грамматики : сб. науч. тр. / под ред. М. И. Конюшкевич. Гродно, 2005. Вып. 5. С. 3–19.

5. *Мухин А. М.* Синтаксема как функциональная синтаксическая единица // Философские науки. 1961. №3. С. 53–65.